белорусский → русский



Серада, 16 Верасень 2020

Віцебскі актывіст і музыка Уладзімір Булаўскі асуджаны на 8 сутак

Друкаваць (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/sud/item/3741-asudzhany-na-8-sutak?tmpl=component&print=1&_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru) | Эл. пошта (https://vitebskspring-org.translate.goog/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=310425d3ffdf4c79bc000aaf5615a4690e4d7cf5&_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(https://vitebskspring-org.translate.goog/media/k2/items/cache/cbdc36bd56eef1b49a4218befad8fa79_XL.jpg?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)

Уладзімір Булаўскі перад "барабанным шэсцем" у Віцебску

Вядомага віцебскага актывіста, музыку, былога каардынатара кампаніі «Будзьма!» у Віцебскай вобласці Уладзіміра Булаўскага прысудзілі 16 верасня да 8 сутак адміністрацыйнага арышту. Яго прызналі вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП) адразу па двух пратаколах. Актывіст

знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання (ІЧУ).

Уладзіміра Булаўскага затрымалі 11 верасня і пасля складання пратаколаў змясцілі ў віцебскі ІЧУ. 14 верасня ягоную справу разгледзеў праз скайп суд Кастрычніцкага раёну. Разбірала яе суддзя **Іна Грабоўская**.

Міліцыянты абвінавацілі Булаўскага ва ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах 10 і 21 жніўня (у справе – два пратаколы). Паводле пратаколаў, актывіст браў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу 10 жніўня і ў шэсці 21 жніўня *(«граў на барабане ў групе грамадзян, якія выкрыквалі лозунгі і трымалі ў руках плакаты…»*).

> Булаўскі не прызнаў сябе вінаватым у правапарушэнні 10 жніўня. Патлумачыў, што, калі яго затрымлівалі, проста стаяў з сябрам на прыпынку і чакаў аўтобуса, каб даехаць да кавярні «Бісквіт». Свой удзел у шэсці 21 жніўня не адмаўляў. Сказаў, што сапраўды граў на барабане і падтрымаў шэсце, рэалізаваўшы тым самым свае канстытуцыйныя правы.

«Лічу, што гэта палітычны ціск на мяне за ўдзел у мірных акцыях», – заявіў Булаўскі наконт свайго затрымання і змяшчэння ў ІЧУ.

Суддзя Іна Грабоўская прызнала актывіста вінаватым і прызначыла пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на 8 сутак. Удакладніла, што адлік тэрміну пакарання адлічваецца ад 13.50 гадзін 13 верасня. Патлумачыла, што двое сутак, якія Булаўскі правёў у ізалятары да 13 верасня, не маюць дачынення да працэсу паводле арт. 23.34.

Стала таксама вядома, што Уладзіміра Булаўскага вінавацяць і ў правапарушэнні, прадугледжаным арт. 17.1 КаАП (дробнае хуліганства). Справу, заведзеную на Булаўскага паводле гэтага артыкулу, разгледзяць у судзе Кастрычніцкага раёну **17 верасня** (дакладны час пакуль невядомы). Артыкул 17.1 прадугледжвае пакаранне ў выглядзе штрафу да 30 базавых велічынь альбо адміністрацыйны арышт.

Зміцер Міраш

Апублікавана ў Суд (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/sud?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru) , Мірныя сходы (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/mirnyja-skhody?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)
Тэгі: Уладзімер Булаўскі (https://vitebskspring-org.translate.goog/itemlist/tag/Уладзімер%20Булаўскі?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru) артыкул 23 34 КаАП (https://vitebskspring-org.translate.goog/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru) ІЧУ (https://vitebskspring-org.translate.goog/itemlist/tag/ІЧУ?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « У Віцебску судзілі анколага, музыку і спецназаўца. Працэсы 15 верасня (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/sud/item/3740-u-vitsebsku-sudzili?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru) «Бачыў, што адбывалася ў ізалятары». Лекара хуткай дапамогі аштрафавалі за ўдзел у акцыі пратэсту » (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/sud/item/3744-bachyu-shto-adbyvalasya-u-izalyatary?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)

Вярнуцца ў пачатак (https://vitebskspring-org.translate.goog/news/sud/item/3741-asudzhany-na-8-sutak?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru#startOfPageId3741)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (https://vitebskspring-org.translate.goog/?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me?_x_tr_sl=be&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru)

